

# ГРОДЗЕНСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН РЭКТАРАТА, ПАРТКОМА, ПРАФКОМАЎ, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

№ 23 (147) 16 кастрычніка 1990 года

## ЗВАРОТ

### НАРОДНЫХ ДЭПУТАТАЎ ГРОДЗЕНСКАГА ГАРАДСКОГА САВЕТА ДА ЖЫХАРОЎ Г. ГРОДНА

**Мы, народныя дэпутаты Гродзенскага гарадскога Савета, звяртаемся да вас у гэты складаны час. У горадзе назіраецца востры дэфіцыт тавараў народнага спажывання, марудна вырашаюцца праблемы жылля, здароўя. Патрабуюць таксама свайго вырашэння пытанні культуры, адукацыі, камунальнай гаспадаркі. Многае ў ажыццяўленні гэтых праблем залежыць ад дэпутацкага корпуса, і, у першую чаргу, ад дэпутатаў гарадскога Савета. Ва ўмовах вострага дэфіцыту прамысловых і харчовых тавараў на 3-й сесіі гарадскога Савета народных дэпутатаў 21-га склікання прыняты шэраг рашэнняў, накіраваных на стабілізацыю спажывецкага рынку ў астатні час бягучага года і на 1991 год.**

**Прымаючы гэтыя адказныя рашэнні, дэпутацкі корпус гарадскога Савета просіць вашага даверу і падтрымкі. Мы заклікаем вас, паважаныя гродзенцы, устрымацца ад правядзення забастовак, мітынгаў, іншых акцый, якія могуць толькі яшчэ больш узмацніць грамадска-палітычнае, сацыяльна-эканамічнае становішча і прывесці да непрадказальнай сітуацыі ў горадзе.**

**Мы за здаровую і канструктыўную крытыку Саветаў, іх органаў і заклікаем вас, паважаныя гродзенцы, пакласці канец нагнятанню нездаровай атмасферы ў горадзе ва ўмовах нестабільнасці ў краіне, якая мацнее з кожным днём. Мы просім вас пэўнымі справамі садзейнічаць прадухіленню эканамічнага і палітычнага хаосу. Мы просім гараджан аказаць дзейсную дапамогу ў забеспячэнні горада бульбай, гароднінай і другой сельскагаспадарчай прадукцыяй. Ваша дапамога гораду, ваш давер гарадскому Савету будуць садзейнічаць стабілізацыі палітычнага і сацыяльна-эканамічнага становішча ў нялёгкі час пераходу да рынычнай эканомікі.**

**Зварот прыняты на 3-й сесіі гарадскога Савета 26 верасня 1990 года.**

## ЁСЦЬ ПЫТАННЕ!

**«Якім чынам могуць уздзейнічаць студэнты на фарміраванне навучальнага працэсу?».**

(пытанне ў адрас рэдакцыі)

Пракаменціраваць яго мы папрасілі **начальніка вучэбнага аддзела нашага універсітэта Юрыя Эдуардавіча БЯЛЫХ.**

Скажу адразу, што ўздзеянне гэта самае непасрэднае. У сакавіку 1990 года дзяржаўны камітэт СССР па народнай адукацыі прыняў загад **»Аб пашырэнні магчымасцей студэнтаў ВНУ і навучэнцаў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў у фарміраванні адукацыйных праграм».** Прыняты гэты загад з мэтай пашырэння магчымасцей вучнёўскай моладзі рэалізаваць свае магчымасці і схільнасці, стварэння ўмоў для іх самаразвіцця і ў сувязі з рэзалюцыяй Усесаюзнага студэнцкага форума.

Такім чынам, гэтыя правы наступныя.

Студэнтам, а менавіта аб іх мы будзем гаварыць, даецца магчымасць вывучыць дадаткова любыя курсы, выкладаемыя ў гэтай (а па ўзгадненню з кіраўнікамі) і ў іншых навучальных установах, уключаючы праходжанне тых відаў практык, якія

Па жаданню студэнтаў у дадатках да дыплома і ў акадэмічных даведках указваюцца аб 'ёмы і адзнакі паспяхова вывучаных імі дадатковых дысцыплін, а тым, хто засвоіў поўную праграму падрыхтоўкі спецыяліста, прысвайваецца ва ўстаноўленым парадку адпаведная кваліфікацыя.

Студэнты маюць магчымасць датэрмінова здаваць экзамены і залікі пры выкананні ўсіх патрабаванняў, прадугледжаных вучэбнай праграмай данай дысцыпліны.

Па рашэнню Вучонага савета ВНУ могуць быць устаноўлены індывідуальныя графікі (планы) навучання з улікам узроўню папярэдняй падрыхтоўкі і здольнасцей студэнтаў. Такім чынам, студэнт мае магчымасць з атрыманнем паглыбленай падрыхтоўкі закончыць адукацыю ў скарочаны тэрмін без змянення абавязковай праграмы навучання і патрабаванняў да спецыялістаў адпаведнай кваліфікацыі.

Студэнты ВНУ, якія маюць асаблівыя поспехі ў навучанні, могуць здаваць экзамены па асобных дысцыплінах у аб 'ёме і ў адпаведнасці з патрабаваннямі, устаноўленымі для аспірантуры.

Як бачыце, паважаныя тава-

НА ПАРАДАК ДНЯ

## ВА ЎМОВАХ КАНКУРЭНЦЫІ

**На апошнім Савеце ГрДзУ, які адбыўся ў канцы верасня, разгледжана праграма дзейнасці універсітэта ў 1990-1991 годзе і на бліжэйшую перспектыву.**

**У дакладзе рэктара універсітэта прафесара А. В. Бадакова, у выступленнях членаў Савета былі прааналізаваны асноўныя тэндэнцыі дзейнасці універсітэта ў галіне падрыхтоўкі кадраў і развіцця навуковых даследаванняў, вызначаны асноўныя напрамкі вырашэння тых праблем, якія ставіць перад калектывам жыццё, рэчаіснасць. Асаблівая ўвага надавалася таму, якім чынам вырашыць праблемы, што непазбежна ўзнікаюць у сувязі з пераходам да рыначных адносін у народнай гаспадарцы краіны. Неабходна арганізаваць і весці падрыхтоўку кадраў так, каб яны былі здольнымі эфектыўна працаваць ва ўмовах недалёкага рынку.**

**Былі глыбока абмеркаваны асноўныя напрамкі дзейнасці рэктарата, факультэтаў і кафедр па арганізацыі набору студэнтаў, павышэнню якасці тэарэтычнай і практычнай падрыхтоўкі будучых спецыялістаў, а таксама іх уладкаванню на працу пасля заканчэння дзяржуніверсітэта. Таксама разгледжаны падрабязна метадычныя і арганізацыйныя пытанні перабудовы вучэбна-выхаваўчага працэсу ў гэтым напрамку.**

**Мы папрасілі прарэктара па вучэбнай рабоце прафесара Сяргея Аляксандравіча ГАБРУСЕВІЧА больш падрабязна спыніцца на некаторых палажэннях праграмы дзейнасці універсітэта.**

— Пачну з таго, што з бягучага года вышэйшыя навучальныя установы рэспублікі, у тым ліку і наш Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Я. Купалы, не маюць, як раней, дзяржаўнага плану прыёму студэнтаў на 1 курс навучання. Савет Міністраў БССР будзе толькі даводзіць да нас кантрольныя паказчыкі запатрабавання рэспублікі ў тых або іншых спецыялістах. Такім чынам, ВНУ давядзецца рыхтаваць столькі спецыялістаў, колькі атрымаюць заказаў ад арганаў упраўлення народнай адукацыі, прамысловых прадпрыемстваў, дзяржаўных установ рэспублікі. У сувязі з гэтым перспектыва нашага універсітэта, напрыклад, звязана з тым, колькі спецыялістаў яму закажуць падрыхтаваць. Такім чынам, мы павінны мець заказ на падрыхтоўку хлопцаў і дзяўчат



па той ці іншай спецыяльнасці.

**— Але ж такога заказу можа і не быць?**

— Так. Мы знаходзімся ва ўмовах канкурэнцыі. Як гэта выглядае, магу паказаць на прыкладзе. Наш універсітэт на 80 працэнтаў рыхтуе кадры для народнай адукацыі. Сёння мы маем дагавор з упраўленнем народнай адукацыі аблвыканкама да 2-тысячнага года. Прычым штогод гэты дагавор удакладняецца, таму што ва універсітэце адкрываюцца новыя спецыяльнасці і дадатковыя напрамкі падрыхтоўкі. Яшчэ ўчора, маючы такі дагавор, мы маглі жыць, як кажуць, спакойна. Але сёння не можам, таму што з гэтага года адменена размеркаванне спецыялістаў, выпускнікоў ВНУ. Нам ужо ніяк не абмежавацца дагаворам з упраўленнем народнай адукацыі, неабходна мець таксама дагаворы з рай- і гарана, бо толькі на падставе іх ёсць магчымасць заключыць індывідуальны дагавор паміж студэнтам і так званым заказчыкам на месцы будучай працы нашага выпускніка. Такім чынам, нават першакурснік павінен ведаць, дзе ён будзе працаваць пасля паспяховага заканчэння універсітэта. Дарэчы, 10 працэнтаў выпускнікоў мы накіроўваем на прадпрыемствы, у асноўным гэта выпускнікі інжынернага факультэта. Сёлета перазаключылі дагаворы з прадпрыемствамі Гродзенскага рэгіёна. Па некаторых спецыяльнасцях праблем няма. Напрыклад, па спецыяльнасці «радыёфізіка і электроніка» сёння мы маем заяўкі на 28 спецыялістаў да 1997 года, а прымаем на 1 курс толькі 25. Што ж датычыцца спецыяльнасці «аптычныя прыборы і сістэмы», а таксама «матэматычнае забеспячэнне ГАП, САПР і АСУ», дык тут праблем яшчэ хапае. Адным словам, неабходна зрабіць вывад: мы павінны рыхтаваць спецыялістаў таго профілю, якія больш патрэбны прадпрыемствам рэгіёну. Дарэчы, неабходна палепшыць і рэкламу нашых выпускнікоў. Бо часта на прадпрыемствах нават не ведаюць, што ва універсітэце ёсць людзі, якія ім так патрэбны сёння, а яшчэ больш будуць патрэбны заўтра.

**— Сяргей Аляксандравіч, думаю, чытач ужо пераканаы ў тым, што наперадзе вялікая работа студэнтаў, выкладчыкаў, словам, усіх тых, хто сёння працуе ва універсітэце. Але ж новыя ўмовы прыёму і ўладкавання будучых спецыялістаў на працу не могуць не выклікаць карэнных змен у арганізацыі падрыхтоўкі спецыялістаў!**

— Згодзен. Гэтыя змены будуць вельмі значнымі. І рыхтаваць іх, а потым праводзіць у жыццё давядзецца кожнаму з нас. Сёння, на мой погляд, галоўны суб 'ект вучэбна-выхаваўчага працэсу — студэнт. Ён павінен добра ўсвядоміць той просты факт, што прыйшоў сюды добраахвотна, вытрымаўшы значны конкурс, каб атрымаць спецыяльнасць, мець кусок хлеба і сваё месца ў жыцці. Маленькі чалавек крочыць у першы клас і ўжо тады гаворыць: «Я вучуся ў першым класе». А студэнт? Ён тым больш павінен **сам вучыцца ва універсітэце**. Адсюль вучэбны працэс павінен быць накіраваны перш за ўсё на тое, каб стварыць усе неабходныя ўмовы для самастойнага авалодання пэўнымі ведамі і навыкамі.

**— Сяргей Аляксандравіч, гаварыць з вамі цікава, але ў невялікім інтэрв 'ю цяжка раскрыць усе дэталі той работы, якая наперадзе. Напэўна, і ў студэнтаў будуць пытанні...**

— З задавальненнем на іх адкажу. Дарэчы, у пачатку семестра рэктарат плануе правесці «круглы стол», на які будзе запрошаны і студэнцкі актыў, усе жадаючыя, каб падрабязна абмеркаваць напрамкі праграмы дзейнасці універсітэта, аб якой ішла гаворка.

## УВАГА: зменены расклад званкоў

| І ЗМЕНА | ІІ ЗМЕНА |
|---|---|
| 8.00—9.20. | 14.00.— 15.20. |
| Перапынак 9.20—9.30. | Перапынак 15.20.—15.30. |
| 9.30.—10.50. | 15.30.—16. 50. |
| Перапынак 10.50—11.00. | Перапынак 16.50.—17.00. |
| 11.00—12.20. | 17.00.— 18.20. |
| Перапынак 12.20—12.30. | Перапынак 18.20.—18.30. |
| 12.30.— 13.50. | 18.30.— 19.50. |

## НА ЭКРАНАХ ТЭЛЕВІЗАРАЎ

### Серада, 17 кастрычніка

#### БЕЛАРУСКАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ

**08.30.** Раніца рэспублікі.

**08.45.** Пра час і пра сябе.

**09.00.** Выяўленчае мастацтва. 8 клас.

**09.35.** Асновы інфарматыкі і вылічальнай тэхнікі.

**10.05.** Нямецкая мова.

**10.35, 11.35.** Біялогія. 6 клас.

**11.05.** «Бурда модэн» прапануе...

**12.05.** «Арэвік». Мастацкі тэлефільм. 1-я серыя.

**13.10.** «Шапэніяна». Фільм-балет.

**13.40.** Дакументальныя тэлефільмы.

**14.20.** «Людзі на балоце». Мастацкі тэлефільм. 2-я серыя.

**16.30.** Караткаметражныя фільмы для дзяцей.

**17.10.** Мультфільмы.

**18.00.** Дзённік Прынёмання (Гр.).

**18.05.** Кіначасопіс.

**18.15.** У студыі — дэлегаты Гродзенскай абласной партканферэнцыі (Гр.).

**19.00.** Панарама.

**19.25.** Тэатр і час.

**20.25.** Фільм-канцэрт.

**20.45.** Калыханка.

**21.00.** Тэлефільм.

**21.40.** «Партнёр-90». Інтэртэлешоу.

**22.10.** На сес іі Вярхоўнага Савета БССР.

**23.10.** «Партнёр-90». Інтэртэлешоу.

### Чацвер, 18 кастрычніка

#### БЕЛАРУСКАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ

**08.30.** Раніца рэспублікі.

**08.40.** Праграма перадач.

**08.45.** Кінанарыс.

**08.55.** Іспанская мова.

**09.25.** Навукова-папулярны фільм.

**09.45.** Прыродазнаўства.

**10.05.** Іспанская мова.

**10.35, 11.35.** Біялогія. 8 клас.

**11.05.** Тэлеэка.

**12.05.** «Арэвік». Мастацкі тэлефільм. 2-я серыя.

**13.40.** Спявае В. Прокушава.

**13.55.** Рытмічная гімнастыка.

**14.25.** «Людзі на балоце». Мастацкі тэлефільм. 3-я серыя.

**16.30.** Музыка і спевы. 4 клас.

**16.50.** Экран дзіцячага фільма. «За лясамі, за гарамі».

**18.00.** Дзённік Прынёмання (Гр.).

**18.05.** «Гарадніца». Інфармацыйна-мастацкая праграма (Гр.).

**18.55.** Рэклама.

**19.00.** Панарама.

**19.20.** Зачытайце маё пісьмо...

**19.30.** Аспекты.

**20.15.** Воднае пола. Чэмпіянат СССР.

**20.45.** Калыханка.

**21.00.** Купальскія песні.

**21.25.** Крок.

**22.10.** На се сіі Вярхоўнага Савета БССР.

**23.10.** Працяг праграмы «Крок».

#### ПЕРШАЯ АГУЛЬНАСАЮЗНАЯ ПРАГРАМА

**06.30.** 120 мінут.

**08.35.** «Візіт да мінатаўра». Мастацкі тэлефільм. 4-я серыя.

**09.45.** «Песенька мышаняці». Мультфільм.

**09.55.** «Роздум пра педагогіку». Памяці Аляксандра Меня.

**10.25.** Вакол свету.

**11.25.** Дзіцячая гадзіна.

**12.25.** Калаж.

**12.30.** Час.

**13.00.** На чэмпіянаце свету па шахматах.

**15.30.** ТСН.

**15.45.** Фільм — дзецям. «Медыум сабінела, або Загадка чароўнай скрыні».

**16.15.** Канцэрт.

**16.45.** «Дзень на зыходзе цяпла». Дакументальны тэлефільм.

**17.15.** Мультфільмы: «Востраў капітанаў». Фільмы 1-ы і 2-і.

**17.45.** Навуковы веснік.

**18.30.** Час.

**19.00.** ...Да 16 і старэйшым.

**19.45.** Мінуты паэзіі.

**19.50.** «Візіт да мінатаўра». Мастацкі тэлефільм. 4-я серыя.

**21.00.** Час.

**21.40.** На чэмпіянаце свету па шахматах.

**21.55.** Па зводках МУС.

**22.05.** Прэм ´ера музыкальнага відэафільма «Спакуса».

**23.25.** «Ступені». Мастацка-публіцыстычная праграма.

**00.40.** ТСН.

**01.05.** «Шклянка вады». Мастацкі тэлефільм. 2-я серыя.

**02.10.** Заспяваем, сябры!

#### ДРУГАЯ АГУЛЬНАСАЮЗНАЯ ПРАГРАМА

**08.00.** Ранішняя гімнастыка.

**08.15.** «У аб ´ектыве — жывёлы. «У пошуках белага крэчата». Навукова-папулярны фільм.

**08.35.** Прыродазнаўства. 5-ы клас.

**17.00.** А ў нас у двары.

**17.30.** Рытмічная гімнастыка.

**18.00.** Кінафестываль. «Прыз сімпатый гледачоў». Прэм ´ера дакументальнага фільма «Данчык». Пра амерыканскага спевака беларускага паходжання Б. Андрусішына.

**18.30.** Час.

**19.00.** «Русь мая, радзіма мілая...» Сяргей Ясенін.

**20.00.** Добрай ночы, малышы!

**20.15.** Калаж.

**20.20.** Музычны абанемент. «На канцэрце Мсціслава Растраповіча». Перадача другая.

**21.40.** На сесіі Вярхоўнага Савета СССР.

**22.10.** Дзённік сесіі Вярхоўнага Савета РСФСР.

**23.10.** «Дульсінея Табоская». Мастацкі тэлефільм. 1-я серыя.

### Пятніца, 19 кастрычніка

#### БЕЛАРУСКАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ

**08.30.** Раніца рэспублікі.

**08.45.** Дакументальны фільм.

**09.00.** Музыка і спевы.

**09.35.** Навукова-папулярныя фільмы.

**09.45.** Гісторыя. 5-ы клас.

**10.05.** Англійская мова.

**10.35, 11.35.** Руская літаратура. 6-ы клас.

**11.05.** Марыя Башкірцава. Дзённікі.

**12.05.** Канцэрт.

**13.15.** Дакументальны фільм.

**13.45.** «Людзі на балоце». Мастацкі тэлефільм.

**16.30.** «Мой сябар — сонца». Спектакль тэатра лялек.

**17.20.** Праграма мультфільмаў.

**18.00.** «Толькі па пятніцах». Інфарамацыйна-публіцыстычная праграма (Гр.).

**19.00.** Панарама.

**19.25.** «На Прынёманскіх прасторах». Літаратурна-мастацкі часопіс (Гр.).

**19.55.** Аспекты.

**20.45.** Калыханка.

**21.00.** Фільм-канцэрт.

**21.50.** «Бацькоўскі дар». Песні жатвы.

**22.10.** На се сіі Вярхоўнага Савета БССР.

**23.10.** «Запомніце мяне такой». Мастацкі тэлефільм. 1-я серыя.

#### ПЕРШАЯ АГУЛЬНАСАЮЗНАЯ ПРАГРАМА

**06.30.** 120 мінут.

**08.35.** «Візіт да мінатаўра». Мастацкі тэлефільм. 5-я серыя.

**09.45.**...Да 16 і старэйшым.

**10.30.** Мультфільмы: «Пра казла». «Мышаня, якое хацела быць падобным да чалавека».

**10.55.** «Мост». Дакументальны фільм.

**11.25.** «Жыві, Зямля».

**12.25.** Калаж.

**12.30.** Час.

**15.30.** ТСН.

**15.45.** Кароткаметражныя мастацкія фільмы для дзяцей: «Маленькі дэтэктыў», «Аднойчы у Шакрыані».

**16.40.** Прэм ´ера дакументальнага тэлефільма «На звалку...»

**17.10.** Філасофскія гутаркі.

**17.55.** Спявае В. Шувалаў.

**18.20.** «Пісьмы з Амерыкі». Перадача 2-я.

**19.15.** Прагрэс. Інфармацыя. Рэклама.

**19.45.** «Візіт да мінатаўра». Мастацкі тэлефільм. 5-я серыя.

**21.00.** Час.

**21.40.** Калаж.

**21.45.** Ва урадзе СССР.

**21.55.** Гэта было...было...

**22.15.** Праграма «ВІД».

**01.15.** ТСН.

**01.40.** «Дзядзькаў сон». Тэлеспектакль. Частка 1-я.

**03.30.** Запрашэнне на вечар. Уладзімір Вінакур.

**04.30.** Маленькі канцэрт.

#### ДРУГАЯ АГУЛЬНАСАЮЗНАЯ ПРАГРАМА

**08.00.** Ранішняя гімнастыка.

**08.15.** Навукова-папулярныя фільмы: «Багамол гуляе ў ханкі», «Дзіўны свет матылькоў».

**08.35.** Гісторыя. 5-ы клас.

**08.55.** Англійская мова.

**17.00.** «Прадмова да горада». (Да 250-годдзя Петрапаўлаўска-Камчацкага).

**18.00.** Спорт для ўсіх.

**18.30.** Час.

**19.00.** Арэна.

**20.00.** Добрай ночы, малышы!

**20.15.** Калаж.

**20.20.** Валейбол. Чэмпіянат свету. Мужчыны. Зборная СССР — зборная Францыі.

**21.20.** Іграе «Класік-ансамбль».

**21.40.** На се сіі Вярхоўнага Савета СССР.

**22.10.** Дзённік сесіі Вярхоўнага Савета РСФСР.

**23.10.** «Дульсінея Табоская». Мастацкі тэлефільм. 2-я серыя.

### Субота, 20 кастрычніка

#### БЕЛАРУСКАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ

**08.30.** Раніца рэспублікі.

**08.45.** «Мастак з Кунгура». Тэлефільм.

**09.00.** «Запомніце мяне такой...» Мастацкі тэлефільм. 1-я серыя.

**10.10.** Народныя рамёствы.

**10.30, 13.40, 17.00.** Тэлевізійны дзіцячы дзень.

**11.00.** Тыдзень планеты.

**11.15.** Цяжкі пераход. Тэленарыс.

**11.30.** «Дзікае паляванне караля Стаха». Спектакль.

**14.30.** Расказваюць тэлежурналісты Грузіі.

**15.30.** «Падсудны». Мастацкі фільм з субцітрамі.

**18.20.** Панарама.

**18.55.** Футбол. Чэмпіянат СССР. ««Дынама» (Мінск) — «Памір» (Душанбэ).

**20.45.** Калыханка.

**21.00.** Фільм-канцэрт.

**21.40.** «Запомніце мяне такой...» Мастацкі тэлефільм. 2-я серыя.

**22.50.** Рэха дня.

#### ПЕРШАЯ АГУЛЬНАСАЮЗНАЯ ПРАГРАМА

**06.30.** 120 мінут.

**08.30.** Наш сад.

**09.00.**Мультфільмы: «Самалёцік», «Рабінзон Кузя».

**09.25.** «Паўночныя звоны». Фільм-канцэрт.

**09.55.** «Партнёр». Камерцыйны веснік.

**10.25.** Пераможцы.

**11.25.** П. І. Чайкоўскі. «Гамлет».

**11.55.** Фільмы рэжысёра Б. Кімягарава. «Сказанне аб Рустаме». 1-я, 2-я часткі.

**14.15.** «Дзіўная Коста-Рыка». Хранікальна-дакументальны фільм.

**15.30.** «Дваццаць гадоў» «Спортлато». Трансляцыя з адкрытага чэмпіянату Масквы па акрабатычнаму рок-н-ролу.

**17.00.** У свеце жывёл.

**18.00.** Міжнародная панарама.

**18.45.** Парламенцкі веснік Расіі.

**19.10.** КВЗ-90. Сустрэча каманд Адэскага дзяржаўнага універсітэта і Варонежскага інжынерна-будаўнічага інстытута. Другі паўфінал.

**21.00.** Час.

**21.40.** На чэмпіянаце свету па шахматах.

**21.55.** «Калі мне будзе 54 гады». Мастацкі тэлефільм.

**23.20.** ТСН.

**23.35.** Праграма «А».

**01.05.** «Дзядзькаў сон». Тэлеспектакль. Частка 2-я.

**03.00.** «Марыца». Тэлефільм.

#### ДРУГАЯ АГУЛЬНАСАЮЗНАЯ ПРАГРАМА

**08.00.** Ранішняя гімнастыка.

**08.20.** «Спадчына чараўніка Бахрама». Мультфільм.

**08.40.** «Зберажы і перадай». Свята сям ´і ў Крапоткіне.

**09.20.** Прэм ´ера дакументальнага фільма «Лёс цырульніка».

**10.00.** Тэлепраграма «Сям ´я»

**11.00.** Відэаканал «Садружнасць».

**14.30.** Відэаканал «Савецкая Расія».

**17.00.** Прагрэс. Інфармацыя. Рэклама.

**17.30.** Калаж.

**17.35.** «Таямніца краіны суніц». Мультфільм.

**17.55.** Футбол. Чэмпіянат СССР.

**19.50.** Дакументальны фільм «У Макса ў Кактэбелі».

**20.00.** Добрай ночы, малышы!

**20.15.** Хакей. Таварысцкая сустрэча ветэранаў. Зборная СССР — зборная Швецыі. 3-і перыяд.

**21.00.** Час.

**21.40.** Дзённік се сіі Вярхоўнага Савета РСФСР.

**22.40.** Валейбол. Чэмпіянат свету. Мужчыны. Зборная СССР — зборная Японіі.

**23.30.** Аўтаралі «Ялта-90.»

**23.50.** «Дэтэктыў...Дэтэктыў... Дэтэктыў». Кінаканцэрт.

**00.50.** «Маленькая паслуга». Мастацкі тэлефільм.

### Нядзеля, 21 кастрычніка

#### БЕЛАРУСКАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ

**08.30.** Раніца рэспублікі.

**08.45.** Парады ўрача.

**09.00.** Тэлевізійная школа ўсходніх адзінаборстваў.

**09.30.** «Запомніце мяне такой...». Мастацкі тэлефільм. 2-я серыя.

**10.45.** Белыя і чорныя.

**11.15.** Творчасць кабардзінскага паэта Алі Шагенцугова.

**11.40.** Вас выклікае Спартландыя.

**12.55.** «Смерць Івана Грознага». Спектакль.

**15.15.** Воднае пола. Чэмпіянат СССР.

**15.45.** Мультфільм.

**16.00.** Сустрэча для вас.

**16.40.** Паміж намі, жанчынамі.

**17.25.** Дэпутацкі канал.

**19.00.** Панарама.

**19.20.** Фільм-канцэрт.

**19.30.** «Партнёр-90». Інтэртэлешоу.

**20.45.** Калыханка.

**21.00.** Тэлефільм.

**21.40.** Працяг праграмы «Партнёр-90».

#### ПЕРШАЯ АГУЛЬНАСАЮЗНАЯ ПРАГРАМА

**08.00.** Спорт для ўсіх.

**08.15.** Другія Усесаюзныя Рэрыхаўскія сустрэчы.

**09.00.**«Раным-рана». Перадача для дзяцей.

**10.00.** На службе Айчыне.

**11.00.** Ранішняя забаўляльная праграма.

**11.30.** Клуб падарожнікаў.

**12.30.** «Здароўе».

**13.15.** Музычны кіёск.

**13.45.** Аэробіка. Вядучая — амерыканская актрыса Джэйн Фонда.

**14.45.** Выступленне дзіцячага ансамбля «Марымба Понес».

**15.15.** У свеце казак і прыгод. Мультфільм «Вук».

**16.45.** Сельская гадзіна. Панарама.

**18.00.** Мультфільм.

**18.15.** «Асколкі разбітага ўшчэнт». Тэлеспектакль.

**19.55.** Песня-90.

**21.00.** Час.

**21.40.** Пра простае і вечнае.

**22.00.** Прэм ´ера лялечнага фільма-канцэрта «Маппет-шоу». 5-я і 6-я серыі.

**22.50.** Футбольны агляд.

**23.20.** Акно ў Тайвань.

**00.10.** «Зялёны фургон». Мастацкі тэлефільм. 1-я і 2-я серыі.

**02.30.** Па просьбе тэлегледачоў. «Што такое цырк?».

#### ДРУГАЯ АГУЛЬНАСАЮЗНАЯ ПРАГРАМА

**08.00.** На зарадку станавіся!

**08.20.** Мультфільм «Раскажыце казку, доктар».

**09.20.** Канцэрт студыі украінскай песні «Берагіня».

**09.25.** Дакументальныя фільмы: «Не ў казцы сказаць», «Стварэнне лесу».

**10.05.** Запрашэнне на танец.

**10.45.** Прэм ´ера дакументальнага фільма «Пустэльнік з Ай-Дэра». Аб захаванні грэцкага арэха.

**10.55.** Аб ´ектыў.

**11.30.** Клуб падарожнікаў.

**12.30.** Прэм ´ера фільма «Саўграмадзянкі ў Афрыцы». Пра лёсы савецкіх жанчын, якія выйшлі замуж за афрыканцаў.

**13.00.** Валейбол. Чэмпіянат свету. Мужчыны. Зборная Венесуэлы — зборная СССР.

**13.30.** Фільмы рэжысёра Ю. Бялянкіна. «Рыгор Свірыдаў».

**14.25.** Калаж.

**14.30.** Відэаканал «Савецкая Расія».

**17.00.** Планета.

**18.00.** Студыя ТФ: «Споведзь удалечыні ад храма». Тэлефільм «Кішэннік». Мультфільм; «Тэлефільм падэску».

**20.00.** Добрай ночы, малышы!

**20.15.** Студыя ТФ: Сюжэт пра кітайскае кіно: партрэт рэжысёра тэлевізійных мастацкіх фільмаў І. Селязнёвай.

**21.00.** Час.

**21.40.** З архіву ТФ: «Пудзіла». Мультфільм; Рэпартаж са здымачных пляцовак; музычны мініканцэрт; «Цыбульнае поле». Прэм ´ера мастацкага тэлефільма.

**23.40.** Класічная барацьба. Чэмпіянат свету.

**00.40.** Аўтаралі «Ялта-90».

---

## ВАВІЛАЎ Васіль Андрэевіч



**Памёр старэйшы член кафедры рускай мовы, ветэран працы і Вялікай Айчыннай вайны Васіль Андрэевіч Вавілаў.**

**В. А. Вавілаў нарадзіўся 13 студзеня 1905 года ў вёсцы Цылні Цылнскага раёна Ульянаўскай вобласці ў сям ´і селяніна-бедняка. Рана страціў бацькоў, таму дзяцінства яго прайшло ў цяжкай сялянскай працы. Пасля заканчэння школы працуе пісьманосцам паштовага аддзялення, справаводам у нарсудзе, а пасля заканчэння курсаў — рахункаводам базы спажыўсаюза. Ужо ў гэтыя гады акрэсліўся яго далейшы жыццёвы шлях як будучага педагога, выхавацеля. Ён актыўны ліквідатар непісьменнасці, потым—курсант пры Казанскім undefinedпедінстытуце.**

**З 1932 г. В. А. Вавілаў — студэнт Казанскага педінстытута. Пасля паспяховага заканчэння ВНУ працуе выкладчыкам рускай мовы і літаратуры ў Татарскай АССР, а ў 1940 г. накіраваны на пастаянную працу ў г. Гродна.**

**Тут яго застала вайна. Эвакуіраваны. А са студзеня 1942 года — непасрэдны ўдзельнік вайны. Цяжкая і небяспечная ратная праца на 1-м і 2-м Беларускіх франтах у якасці начальніка радыёстанцыі. Паранены. За мужнасць і адвагу ўзнагароджаны чатырма баявымі медалямі.**

**Пасля дэмабілізацыі зноў любімая работа: выкладчык мовы і літаратуры міжабласной партыйнай школы, а з 1974 года — выкладчык Гродзенскага педінстытута.**

**В. А. Вавілаў паказаў сябе як таленавіты, творчы вучоны — метадыст. Яго багаты навукова — выкладчыцкі вопыт абагульнены ў шэрагу артыкулаў і манаграфій. Састаў слова, дзеяслоў, складаныя сінтаксічныя канструкцыі і методыкі іх выкладання ў школе — важнейшыя даследаванні В. А. Вавілава. Яго манаграфія «Практычны дапаможнік па рускай мове» — настольная кніга выкладчыка і студэнта.**

**Навукова-метадычная дзейнасць В. А. Вавілава атрымала высокую ацэнку: у 1967 г. па сукупнасці прац, без абароны кандыдацкай дысертацыі, яму прысвоена званне дацэнта. Неаднаразова ўзнагароджваўся Ганаровымі граматамі.**

**З 1968 года В. А. Вавілаў ідзе на заслужаны адпачынак, але і ў гэты час ён не парывае сувязі з кафедрай, са студэнтамі, працягвае навуковую работу.**

**Памёр цудоўны педагог, чалавек высокай культуры, выключна просты, спагадлівы таварыш. Яго жыццёвае крэда было — усё для іншых.**

**Светлая памяць аб В. А. Вавілаве назаўсёды застанецца ў нашых сэрцах.**

**Група таварышаў.**


Наш адрас: 230023, г. Гродна, вул. Ажэшка, 22, пакой 404, тэл. 44-80-70

Газета выходзіць штотыднёва

Гродзенская абласная ўзбуйненая друкарня вул. Паліграфістаў, 4.

Зак. 7156

Тыраж 2000 экз.

Рэдактар Л. С. ЗАСЕЛЬСКАЯ.